# ФАРМІРАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

***Ю. Літвіноўская***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*вул. П. Бровкі, 6, 220013, г. Мінск, Беларусь,* litwinowski@yandex.by

Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, моцнай дзяржавы з цэнтралізаванай вярхоўнай уладай, мела сур’ёзныя наступствы, некаторыя з іх – пазітыўнага характару. У крае адбылася пэўная палітычная стабілізацыя, прыпынілася феадальная анархія. На далучаныя тэрыторыі паступова распаўсюджвалася расійскае заканадаўства. Рознага рода ўрадавыя пастановы вызначалі парадак, функцыі і прынцыпы дзейнасці адміністрацыйна-судоваго і сацыяльна-гаспадарчага кіравання. Жорсткаму адміністрацыйнаму кантролю падлягалі прктычна ўсе бакі сялянскага жыцця. У барацьбе за кіруючыя пасады часам узнікалі супярэчнасці паміж рускай адміністрацыяй і мясцовым дваранствам, што вяло да праявы яго  незадаволенасці другараднай роляй у бюракратычным механізме царызму.

***Ключавыя словы:*** дзяржава, ўлада, губернія, адміністрацыйны падзел, установа.

# ФОРМИРОВАНИЕ ГОСУДАРСТВЕННЫХ ОРГАНОВ УПРАВЛЕНИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XIX В.

***Ю. Литвиновская***

*Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники*
*ул. П. Бровки, 6, 220013, г. Минск, Беларусь,* litwinowski@yandex.by

Включение белорусских земель в состав Российской империи, сильного государства с централизованной верховной властью, имело серьезные последствия, некоторые из них – позитивного характера. В крае произошла определенная политическая стабилизация, приостановилась феодальная анархия. На присоединенные территории постепенно распространялось российское законодательство. Различного рода правительственные постановления определяли порядок, функции и принципы деятельности административно-судебного и социально-хозяйственного управления. Жёскому административному контролю подлежали практически все стороны крестьянской жизни. В борьбе за руководящие должности порой возникали противоречия между русской администрацией и местным дворянством, что вело к проявлению его недовольства второстепенной ролью в бюрократическом механизме царизма.

***Ключевые слова:*** государство, власть, губерния, административное деление, учреждение.

# FORMATION OF STATE GOVERNING BODIES ON BELARUSIAN LANDS IN THE FIRST HALF OF THE XIX CENTURY.

***Y. Litvinouskaya***

*Belarusian state University of Informatics and Radioelectronics*
*P. Brouki St., 6, 220013, Minsk, Belarus,* litwinowski@yandex.by

The inclusion of the Belarusian lands into the Russian Empire, a strong state with centralized supreme power, had serious consequences, some of them of a positive nature. There was a certain political stabilization in the region, feudal anarchy was suspended. Russian legislation was gradually extended to the annexed territories.

Various kinds of government resolutions determined the order, functions and principles of the administrative-judicial and socio-economic management. All aspects of peasant life were subject to strict administrative control. In the struggle for leadership positions, contradictions sometimes arose between the Russian administration and the local nobility, which led to the manifestation of his dissatisfaction with a secondary role in the bureaucratic mechanism of tsarism.

***Keywords:*** state, government, province, administrative division, institution.

У канцы XVIII ст. спыніла свае існаванне адна з самых буйных дзяржаў Еўропы – Рэч Паспалітая. У выніку яе трох падзелаў (1772, 1793, 1795) зробленых больш моцнымі суседзямі беларускія землі з насельніцтвам каля 3 мільёнаў чалавек апынуліся ў складзе Расійскай імперыі. Прыеднанне тэрыторыі Беларусі да Расіі безумоўна мела значныя наступствы ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці беларускага народа. Паслабіўся рэлігійны і нацыянальны прыгнёт, прыпыніліся разбуральныя канфлікты паміж рознымі групоўкамі буйных магнатаў, што ў сваю чаргу садзейнічала актывізацыі эканамічнага жыцця.

З свайго боку царскі ўрад імкнуўся прыцягнуць на свой бок пануючае саслоўе новых зямель. Польская і апалячаная шляхта атрымалі тыя ж правы і прывілеі, што і расійскае дваранства. Іх статус вызначаўся “Жалованой грамотой дворянству” 1785 г.

У той жа час царскі ўрад імкнуўся стварыць сабе апору ў крае ў выглядзе рускага землеўладання. Толькі Кацярына II і Павел I падаравалі расійскім саноўнікам больш за 200 тыс. рэвізскіх душ. Расійскім дваранам раздаваліся былыя дзяржаўныя ўладанні, канфіскаваныя маёнткі свецкіх і царкоўных уласнікаў, якія выступілі супраць новай улады і эмігрыравалі за мяжу.

Вынікам такой палітыкі было рэзскае (амаль у 3 разы) скарачэнне колькасці дзяржаўных сялян на Беларусі [1, с. 112]. Пераход жа сялян у прыватную ўласнасць адмоўна адбіваўся на іх матэрыяльным стане.

Мяшчане беларускіх гарадоў пасля далучэння да Расіі пазбаўляліся часткі сваіх правоў і павінны былі плаціць падушныя падаткі, выконваць рэкруцкую і іншыя павіннасці. Большую частку гарадского насельніцтва складалі рамеснікі – майстры, падмайстры і іх вучні, якія аб’ядноўваліся ў цэхі. Прывілеяванымі жыхарамі гарадоў былі фабрыканты і купцы першай і другой гільдый [2, с. 144].

Магдэбургскае права на Беларусі скасоўвалася. На гарады, якія яго мелі і мястэчкі, якія былі цэнтрамі паветаў, былі пашыраны прынцыпы гарадскога кіравання для расійскіх гарадоў, паводле “Жалованной грамоты городам” 1785 г. [3, с. 154].

Сутнасць палітыкі царызму на Беларусі была прадваранская. Гэта вынікае з таго, што прадумовай прынясення прысягі мясцовай шляхтай на вернападданасць расійскім уладам захоўвалась недатыкальнасць фактычна існуючага землеўладання. Царскі ўрад пайшоў і на пэўныя ўступкі мясцоваму дваранству-шляхце, аднавіў у 1796 г., дзейнасць Статута Вялікага Княтства Літоўскага 1588 г., некія былыя назвы (паветы замест уездаў), пасады (павятовы маршал, падкормій, павятовы харунжый, і інш.) і судовыя ўстановы, ўнеся толькі нейкія змены. На тэрыторыі Беларусі нормы Статута захоўваліся да паўстання 1830 г. [4, с. 70, 76].

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падел на тэрыторыі Беларусі неаднаразова зменьваўся. Пасля далучэння ў 1772 г. паўночна-усходніх земляў Беларусі да Расіі ствараюцца дзве новыя губерні Пскоўская (пасля пераўтвараная ў Полацкую) і Магілёўская. У пастанове Сената ад 8 мая 1773 г. гаварылася: "... учредя с самого начала в присоединенных к Российской империи из польских земель двух новых губерний" [5, с. 37]. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі меняўся некалькі разоў, толькі з 1793 г. па 1796 г. – 3 разы, пакуль у 1802 г. былі ўтвораны 5 губерняў з цэнтрамі ў Віцебску, Магілёве, Мінску, Гродне і Вільне. Гэты падел існаваў аж да рэвалюцыі 1917 г.

Далучэнне тэрыторыі Беларусі да Расіі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай спрыяла паслабленню рэлігійнага і ў некаторай ступені нацыянальнага прыгнёта, спрыяла спыненню разбуральных узброеных канфліктаў паміж рознымі групоўкамі буйных магнатаў і, ў канчатковым выніку, садзейнічала эканамічнаму развіццю края.

У першыя гады пасля далучэння Беларусі царскі ўрад, улічваючы цяжкае эканамічнае становішча насельніцтва, быў вымушаны паменшыць падаткі або на некаторы час наогул адмяніць іх спагнанне. Так, па ўказу Кацярыны II ад 13 снежня 1772 г. жыхары Пскоўскай і Магілёўскай губерняў былі вызваленыя ад выплаты падаткаў на паўгода, а па яе ж ўказу ад 17 красавіка 1773 г. памер падаткаў, спаганяемых з насельніцтва гэтых двух губерняў, быў паменшаны. Жыхары тэрыторыі, якая адышла да Расіі па другім падзеле, поўнасцю вызваляліся ад выплаты падаткаў на два гады [4, с. 69].

Палепшалася эканамічнае становішча краю. Павялічваўся памер пясяўных плошчаў. Толькі ралля памешчыкаў да сярэдзіны XIX ст. вырасла ў параўнанні з 70–80-мі гадамі XVIII ст. у сярэднім у 3–4 разы.

Уздым сельскай гаспадаркі спрыяў росту гандлю, купецтва, гарадоў. Царскі ўрад выкупляў гарады з прыватнага валодання феадалаў. Напрыклад, г. Рагачоў, м. Дрыса былі выкупленыя і ў 1777 г. пераўтвораны

ў павятовыя гарады. У кожнай губерні Беларусі ў год адбывалася ад 50 да 70 кірмашоў [4, с. 69].

У губернях, як гэта і было прынята ў Расіі згодна з “Устаўленнем кіравання губерняў Усерасійскай імперыі” ад 1795 г. налічвалася 300–400 тыс. чалавек мужчынскага полу. У палітычных а таксама адміністрацыйных мэтах (кіраваць вялікімі па памерах губернямі было нязручна), Аляксандр I у 1801 г. згодна з новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам аб’яднаў новыя губерні ў два генерал-губернатарствы: Літоўскае (Віленская, Гродзенская і Мінская губерні) і Беларускае (Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні). У фіскальна-паліцэйскіх мэтах губерні былі падзелены на паветы па 20–30 тыс. чалавек падатковага, або рэвізскага насельніцтва ў кожным [6, с. 602].

Галоўнай асобай у губернях быў генерал-губернатар, які лічыўся намеснікам цара і ўзначальваў мясцовую адміністрацыю падпарадкаваных яму тэрыторый. Ён быў надзелены неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Яму падпарадкоўваліся вайсковыя і грамадзянскія губернатары, якія выступалі “блюстителями неприкосновенности верховных прав самодержавия … и повсеместного точного исполнения законов, высочайших повелений, указов правительствующего Сената и предписаний начальства” [7, с. 161]. У абавязак губернатара, згодна палажэнню 1837 года, уваходзіў нагляд за зборам падаткаў і па недапушчэнню нядоімак, здачай водкупаў, заключэнням казённых падрадаў і паставак (ніжнімі і павятовымі земскімі судамі). Яны непасрэдна займаліся камплектаваннем і забеспячэннем войск, гарнізонаў, рэкруцкімі наборамі. Іх паліцэйскія функцыі зводзіліся да падтрымання “общественного порядка и спокойствия”, недапушчэння ўзнікнення і дзейнасці “тайных и запрещённых обществ”, выкаранення бадзяжніцтва, лоўлі дэзерціраў і беглых, садзейнічання сацыяльнай дабрачыннасці. У іх руках знаходзіўся нагляд за ходам следства па крымінальна-грамадзянскіх справах. Але канчатковае рашэнне па ўсіх пытаннях жыцця губерні прымаў генерал-губернатар, таму ўлада грамадзянскага губернатара была даволі абмежаванай. І генерал-губернатары і грамадзянскія губернатары прызначаліся царом з ліку іх давераных асоб, вышэйшых саноўнікаў імперыі. Персанальны склад вышэйшай адміністрацыі кожнай губерні, канцылярыі генерал-губернатара складаўся з рускіх чыноўнікаў.

Варта адзначыць пры гэтым, што і сярод генерал-губернатараў і сярод грамадзянскіх губернатараў былі частыя персанальныя змены. Так, з 1776 па 1856 г. пасаду генерал-губернатара на Беларусі займаў 21 саноўнік. За першую палову XIX ст. па Віцебскай губерні змянілася 17 губернатараў, па Гродзенскай — 16, Мінскай — 15, Магілёўскай — 14 [8, с. 271–272].

Прычынай гэтай з’явы было вялізарнае распаўсюджванне карупцыі і пратэкцыянізму сярод гэтай катэгорыі вышэйшых пасадовых асоб.

Дарадчым і выканаўчым органам у губерні было губернскае праўленне, якое складалася з “общего присутствия” і канцылярыі. Але, як правіла, пасяджэнні “общего присутствия” мелі фармальны характар і ўсе найбольш важныя справы вырашаліся асабіста генерал-губернатарам, або грамадзянскім губернатарам, праз губернскую канцылярыю. Канцылярскі штат складаўся з 379 асоб розных рангаў — ад віцэ-губернатара да вартаўніка. А для пасылак губернатар меў 132 чалавекі ваеннай каманды [9, с. 169].

У сваёй дзейнасці губернскія дзяржаўныя органы абапіраліся на дваранскія сходы і губернскага прадвадзіцеля дваранства, які на Беларусі называўся па ранейшаму — маршалкам.

Галоўным органам павятовай улады быў ніжні земскі суд, які адначасова выконваў і адміністрацыйна-паліцэйскія і судовыя функцыі. Яго ўзначальваў земскі спраўнік, які, у адрозненне ад паветаў цэнтральнай Расіі, не выбіраўся дваранамі, а прызначаўся Сенатам па прадстаўленню губернатара і са згоды міністра ўнутраных спраў. Земскі спраўнік прызначаўся з ліку мясцовых дваран. Прадстаўнікамі мясцовых дваран былі таксама два–тры засядацелі ніжняга земскага суда. Важнае месца сярод службовых асоб павета займаў павятовы прадвадзіцель дваранства — павятовы маршалак. Галоўнымі задачамі ніжняга земскага суда было падтрыманне грамадскага парадку і забеспячэнне своечасовага выканання жыхарамі павета розных павіннасцей.

Кожны павет падзяляўся на 6 ключоў на чале з войтамі, абранымі “из людей средних лет, но честных и зажиточных” з асяроддзя землеўладальнікаў або іх эканомаў. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзесятнікі, якія выбіраліся сялянскім мірам “из добрых и незазорных” сялян. Сотнікі выбіраліся ад 100–200 двароў, дзесятнікі — ад 1–25. Названыя асобы прызначаліся паліцэйска-выканаўчай уладай на месцах.

Галоўным абавязкам павятовай паліцыі быў дагляд па недапушчэнню самавольных перамяшчэнняў “воров, разбойников, пришельцев, бродяг”. Дзеля гэтага ўводзілася пашпартная сістэма рэгістрацыі міграцыі насельніцтва. Пашпарты выдаваліся са згоды памешчыкаў у правінцыяльных канцылярыях, а пазней — павятовымі земскімі судамі [8, с. 271].

У далейшым паліцэйска-бюракратычная рэгламентацыя сацыяльна-гаспадарчых адносін пашыралася і дэталізавалася. З 1837 г. для ўзмацнення адміністрацыйнага кантроля на месцах, для прадухілення народных хваляванняў паветы пачалі дзяліць на станы. У кожны стан

губернатар прызначаў, часцей за ўсё з адстаўных афіцэраў, станавога прыстава. Ён падпарадкоўваўся земскаму спраўніку і выконваў паліцэйскія функцыі.

У 1837–1838 гг. ў губернях былі ўтвораны акругі, тэрыторыя якіх магла ахопліваць адзін, або некалькі паветаў. Яны ствараліся для нагляду за дзяржаўнымі сялянамі. На чале акругі стаяў акружны начальнік з двума памочнікамі. Акругі ў сваю чаргу дзяліліся на воласці. У воласці кожныя тры гады сяляне выбіралі валаснoе праўленне ў складзе валаснога галавы і двух засядацеляў.

Органы кіравання ў беларускіх гарадах ствараліся на падставе агульнарасійскага закона 1782 г. “Устав благочиния”. Згодна з гэтым законам у кожным горадзе ствараліся “Управы благочиния” да якіх уваходзілі гараднічы, прыстаў крымінальных спраў, цывільных спраў і два ратманы. Гараднічы прызначаўся Сенатам па прадстаўленню генерал-губернатара, або грамадзянскага губернатара. Вельмі часта гэта былі адстаўныя ваенныя чыны. Пасля далучэння да Расіі гарады Беларусі страцілі свой статус які мелі паводле магдэбургскага права нягледзячы на тое, што іх саслоўныя выбарчыя органы — магістраты захаваліся. Магістраты апынуліся пад моцным кантролем губернатараў і іх чыноўнікаў і былі пазбаўлены самастойнасці ў вырашэнні гарадскіх спраў.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Козловский П.Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в конце XVIII–первой половине XIX вв. — Минск: Наука и техника, 1982.
2. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. — Минск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003.
3. Исаев И.А. История государства и права России. — М.: Юрист, 1998.
4. Кузнецов И.Н., Шелкопляс В.А. История государства и права Беларуси. — Минск: Дикта, 1999.
5. Белоруссия в эпоху феодализма. В 4 т. — Минск: Наука и техника, 1961. — Т. 3.
6. ПСЗРИ. — СПб., 1830. — Т. XIX.
7. Блинов И. Губернаторы. Историко-юридический очерк. — СПб., 1905.
8. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. — Минск: Беларусь, 1994. — Ч. 1.
9. Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права ў дакументах і матэрыялах. — Минск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003.